„sat History» или «Animal Planet» и др. Из российских каналов, которые частично транслируются у нас в Беларуси, по прежнему интересен и познавателен канал «Культура», хотя он интересен для более старшей аудитории. Правда, данные каналы не входят в обязательную сеть вещания, они относятся к так называемому «коммерческому телевидению», и далеко не все жители нашей страны имеют возможность смотреть подобные передачи. А уж новостные программы, и в частности программы канала НТВ, мы стараемся не включать совсем.

**Список цитированных источников**


1. Брайант, Дженнингз. Основы воздействия СМИ / Дж. Брайант, С. Томпсон. – Москва; Санкт-Петербург; Киев; Вильямс, 2004.
2. Гридчин, М.М. Проблемы влияния информационных технологий на молодёжь / М.М. Гридчин // Власть. - 2007. - № 9. – С. 37- 40.
3. Бароло, Э. ТВ и компьютеры - угроза интеллекту / Э. Бароло // Литературная газета. 1983. - № 35. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.mediaeducation.boom.ru
4. Доклад о состоянии здравоохранения в мире. ВОЗ, 2001. http://www.who.int
5. Федоров, А.В. Насилие на экране // Человек. – 2004. – № 5. – С. 142-151.
6. Федоров, А.В. Права ребенка и проблема насилия на российском экране. – Таганрог, 2004.
7. Тарасов, К.А. Насилие в фильмах: катарсис или мимесис? [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://vivovoco.astronet.ru/VV/MISC/5/MIMARSIS.HTM
8. Золотов, Е.А. Воздействие аудиовизуального насилия на подрастающее поколение России: историко-культурологический аспект / Электронный журнал "Знание. Понимание. Умение". – 2008. – № 4. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.zpu-journal.ru/zpu/
9. Рогозянский, М.Э. Воспитательный потенциал телевидения: теоретические вопросы, осмысленные практиком / М.Э. Рогозянский // Образование и общество. – 2008. – № 2. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://setilab.ru/ms/news/2008/02/
10. Бакулев, Г.П. Массовая коммуникация: западные теории и концепции. – М., 2007.


## СЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ І ДЭСЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ


В.А. Адзіночанка

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, г. Гомель, Беларусь*


Нам неабходна выходзіць з таго, што сучасная Беларусь перажывае працэс усебаковай трансфармацыі. Яна не зводзіцца толькі да чыста знешніх змен, а мае сістэмны характар. Мы бачым, як паступова іншы воблік набываюць усе сферы нашага жыцця, але мяняецца таксама аснова грамадства. Трэба адзначыць, што ўзнікненне сучаснай Беларусі – вынік так званага працэсу перабудовы, які быў пачаты ў сярэдзіне 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў Савецкім Саюзе па ініцыятыве тагачаснага камуністычнага кіраўніцтва краіны. Прадугледжвалася, што перабудова прывядзе да абнаўлення і паскоранага развіцця савецкага грамадства. Але працэсы набылі некантралюемы характар, што прывяло да змены дзяржаўнага ладу, краху сацыялістычнай сістэмы, распаду Савецкага Саюза. Развіццё тых дзяржаў, якія ўзніклі на яго месцы, пайшло рознымі шляхамі, абапіраючыся на ўласныя культурныя традыцыі. Працягваецца працэс мэтанакіраванага адраджэння гэтых традыцый, важнай часткай якіх з'яўляецца рэлігія. Такім чынам, у канцы XX стагоддзя ў былых савецкіх рэспубліках пачаўся працэс пашырэння рэлігійнай сферы ў грамадстве, і менавіта гэта – адна з характэрных рыс іх сучаснага жыцця.

Слова *сучасны* мае два асноўныя значэнні: *"якія адносіцца да сённяшняга, цяперашні, і які адпавядае патрабаванням свайго часу, не адсталы"* [1, с. 640]. У сацыялогіі сучаснасць тлумачыцца праз яе супрацьпастаўленне традыцыйнаму грамадству. Калі для апошняга была характэрна натуральная эканоміка, манархічны спосаб, праўленне і панаванне рэлігіі ў духоўнай сферы, дык сучаснасць – гэта такі стан развіцця

грамадства, дзе існуе рынычная эканоміка, дэмакратычны лад жыцця і адбываецца (альбо ўжо завершаны) працэс секулярызацыі. Такім чынам, секулярызацыя разумеецца як неад'емны кампанент працэсаў, якія робяць тое ці іншае грамадства сучасным.

Працэс секулярызацыі адбываецца ў Еўропе, пачынаючы з XV ст. Само слова *секулярызацыя* паходзіць ад познелацінскага *saecularis – мірскі, свецкі*. Спачатку яно ўжывалася як чыста юрыдычны тэрмін і азначала прымусовую передачу царкоўнай маёмасці ва ўласнасць дзяржавы. Потым стала разумецца ў больш шырокім сэнсе, як працэс вызвалення са сферы рэлігійнага санкцыянавання чалавечай свядомасці, паводзін і дзейнасці людзей, сацыяльных адносін і інстытутаў. Еўрапейская культура паступова набывала ўсё больш свецкі характар, і тыя яе галіны, якія раней знаходзіліся пад уплывам рэлігіі, рабіліся самастойнымі і сталі развівацца, абапіраючыся перш за ўсё на свае ўласныя прынцыпы.

Трэба падкрэсліць, што секулярызацыя – феномен перш за ўсё еўрапейскага грамадства. Бо менавіта для Еўропы было характэрна саперніцтва паміж рэлігійнымі і свецкімі ўладамі. Каталіцкая царква, якая аказала вельмі вялікі ўплыў на фарміраванне еўрапейскай культуры, была незалежнай ад свецкіх улад і мела вялікае багацце. Калі пачалі ўзмацняцца нацыянальныя дзяржавы, іх кіраўніцтва стала праводзіць палітыку пераразмеркавання царкоўнай улады і багацця на сваю карысць. Зараз у еўрапейскіх краінах улада мае цалкам свецкі характар, хаця ў некаторых з іх рэлігійныя арганізацыі адыгрываюць значную ролю ў палітычным жыцці.

Найбольш яскрава працэс секулярызацыі назіраецца ў сферы духоўнай культуры. Яшчэ ў перыяд Адраджэння фарміруецца вопытная навука, якая ажыццяўляе свае даследаванні незалежна ад рэлігійных палажэнняў. Менавіта праз намаганні навукі была створана сучасная карціна свету. Пры гэтым многія даследчыкі адзначаюць, што навука – феномен менавіта еўрапейскай культуры, яна фарміравалася веруючымі людзьмі, якія абапіраліся на агульныя светапоглядныя ўстаноўкі, зафіксаваныя ў Бібліі. Але спроба царквы пракантраляваць развіццё навукі прывяла да канфлікту. Сучасная царква выходзіць з прызнання аўтаномнасці навуковых даследаванняў і спрабуе наладзіць дыялог з ёй.

Больш беспраблемна працэс секулярызацыі адбываўся ў галіне мастацтва. Калі ў сярэднявеччы царква была галоўным заказчыкам мастацкіх твораў, якія ствараліся пераважна на рэлігійныя сюжэты, дык пачынаючы з XIV ст., мастацтва робіцца ўсё больш свецкім. Абумоўлена гэта пашырэннем сферы мастацтва, яго творы пачынаюць замаўляць свецкія правіцелі, а потым багатыя людзі. Пачынаючы з XIX ст., мастацтва робіцца ўсё больш масавым, многія яго галіны пачынаюць функцыянаваць па законах індустрыяльнай вытворчасці і накіраваны на атрыманне найбольшага прыбытку. Вельмі часта распаўсюджванне масавай культуры ўтрымліваюць ў сабе разбуральныя для чалавечай свядомасці і маралі элементы, што выклікае негатыўную рэакцыю з боку рэлігійных арганізацый і грамадства ў цэлым.

Секулярызацыя ў сферы культуры разумелася мнавіта як вызваленне. Яго характар быў звязаны з дзвюма асноўнымі крытычнымі ўстаноўкамі пры аналізе ролі рэлігіі ў грамадстве. Яна магла разумецца як праява цемрашальства і забабонаў, і тады яе пераадольванне звязвалася з развіццём ведаў. Альбо рэлігія разглядалася як сацыяльны інстытут, які выкарыстоўваецца пануючымі класамі ў сваіх інтарэсах. Тады барацьба з рэлігіяй звязвалася з сацыяльнымі пераўтварэннямі.

Але ў любым выпадку пераадольванне ўплыву рэлігіі ў грамадстве разглядалася як частка агульнай установкі еўрапейскай культуры на прагрэсіўнае развіццё. Прагрэс (ад лац. *progressif – рух наперад, посьпех*) – гэта накірунак развіцця ад ніжэйшага да вышэйшага, ад менш дасканалага да больш дасканалага. Лічылася, што прагрэсіўнае развіццё забяспечваецца перш за ўсё праз распаўсюджванне навуковых ведаў і рацыянальную арганізацыю сацыяльнага жыцця.

Такім чынам, распаўсюджванне рэлігіі ў постсавецкіх краінах з пункту погляду ўстановак еўрапейскай культуры Новага часу можа разглядацца як нейкі адкат у прагрэсіўным развіцці альбо праява спецыфікі іх сітуацыі, а менавіта – адмаўленне ад атэістычнага мінулага. Але дэсекулярызацыя ў канцы XX ст. мае і іншыя праявы. Паказальным для нас з'яўляецца не ўзмацненне пазіцый ісламу ва ўсходніх краінах, а пашырэнне сферы рэлігіі ў еўрапейскай культуры. Мы можам зрабіць выснову, што ў нас адбываюцца тыя ж працэсы, што і ў Еўропе ў цэлым.

Дэсекулярызацыя не абвяргае ўстаноўку еўрапейскага грамадства на прагрэсіўнае развіццё, але сведчыць пра яго больш складаны характар, чым гэта ўяўлялася мысліцелям Новага часу. Па-першае, ён мае нелінейны характар, і мы не можам папярэдне вызначыць яго накіраванасць і крытэрыі. Па-другое, у XX ст. была асэнсавана небяспека пабудовы грамадства ў адпаведнасці з жорстка вызначанымі рацыянальнымі схемамі, паколькі гэта прывяло да таталітарызму.

У Савецкім Саюзе была зроблена спроба пабудаваць сваю мадэль сучаснага грамадства, якое лічылася найбольш прагрэсіўным. Гэты працэс прадугледжваў поўнае пераадольванне ўплыву рэлігіі на грамадства і свядомасць асобных людзей. Жорсткая атэістычная ўстаноўка стваральнікаў савецкай дзяржавы была шмат у чым абумоўлена тым, што ў царскай Расіі праваслаўная царква, да якой адносілася большасць насельніцтва, не была аддзелена ад дзяржавы і з'яўлялася дзяржаўным інстытутам, а таму разглядалася як адзін з інстытутаў прыгнёту, які павінен быць знішчаны. Трэба адрозніваць секулярызацыю ў Заходняй Еўропе, якая ўяўляла сабой вызваленне розных сфер грамадства ад уплыву рэлігіі і развіццё іх на аснове сваіх уласных прынцыпаў, ад атэістычнай палітыкі ў Савецкім Саюзе, якая зводзілася да планамернага знішчэння рэлігіі. Рэлігія разглядалася як форма антыкамуністычнай ідэалогіі, і таму вельмі часта прыхільнасць да рэлігіі з'яўлялася формай апазіцыі ўладзе.

Працэс адраджэння рэлігіі пачаўся яшчэ ў савецкія часы. За яго пачатак бярэцца 1988 г., калі святкавалася 1000-годдзе хрышчэння Русі. Відавочным паказчыкам рэлігійнага адраджэння на Беларусі з'яўляецца рост колькасці зарэгістраваных рэлігійных суполак. За перыяд з 1988 да 2013 гг. яна павялічылася больш чым у 4 (з 768 да 3251), а колькасць рэлігійных кірункаў – у 3 разы. Радыкальна змяніўся сам падыход да трактоўкі рэлігіі. Да гэтага яе разглядалі пераважна з ідэалагічнага пункту погляду. Выходзілі з таго, што "па сваёй сутнасці рэлігія з'яўляецца адным з відаў ідэалістычнага светапогляду, які супрацьстаіць навуковаму" [2, с. с. 576], а яе роля ў грамадстве заключаецца ў тым, што яна "з'яўляецца адным з інструментаў, пры дапамозе якіх ідэі пануючых класаў робяцца пануючымі ў дадзеным грамадстве ідэямі" [2, с. 577]. Зараз падыход да трактоўкі рэлігіі з'яўляецца пераважна культуралагічным. Рэлігія разглядаецца з пункту погляду розных падыходаў, але большасць аўтараў (прынамсі тых, якія прэтэндуюць на навуковасць) імкнецца пазбегнуць ідэалагічнай ангажаванасці. Напрыклад, сцвярджаецца, што "сёння агульнапрызнана, што хрысціянства ў сукупнасці яго галоўных разнавіднасцей – каталіцтва, праваслаўя і пратэстанцтва – аказала вызначальны ўплыў на фарміраванне заходняй цывілізацыі" [3, с. 439-440] і "каталіцкая ідэя аб магчымасці рацыянальнага пазнання атрыбутаў Бога (натуральная тэалогія), уяўленне аб Сусвеце як рэалізаванай Божай задуме, безумоўна, стымулявалі развіццё навукі" [3, с. 440]. У літаратуры ідэалагічнага накірунку пішацца пра "хрысціянскія асновы беларускай нацыі" [4, с. 20], падкрэсліваюцца станоўчыя вынікі хрысціянізацыі нашых земляў: "Рэлігійная ідэалогія развівала маральна-этычныя, свядомасныя адносіны да жыцця, гуманістычныя памкненні людзей да ўсталявання мірнага суіснавання з суседзямі, ініцыіравала паказ хараства душы чалавека і падзяляла яго стваральную існасць" [4, с. 21]. Таксама праз СМІ распаўсюджваецца ідэя, што хрысціянства – гэта аснова маральнасці.

Пры гэтым, на наш погляд, трэба пазбягаць небяспекі іншай крайнасці, калі рэлігійнаму светапогляду прыпісваюцца ўсё магчымыя станоўчыя якасці, а атэістычнаму – ўсе адмоўныя. Атэізм і вальнадумства – неад'емныя складнікі еўрапейскай культурнай традыцыі. Дастаткова назваць імёны такіх мысліцеляў як Русо, Вальтэр, Феербах, Расэл, Сартр. Вальнадумцы і атэісты былі таксама і на Беларусі: С. Будны, С. Лован, К. Бекеш, К. Лышчынскі.

Само функцыяванне вальнадумства і атэізму прадугледжвае наяўнасць у краіне пэўнай ступені свабоды думкі, а таксама вопыту палемікі паміж прыхільнікамі розных пунктаў погляду на рэлігію. У Савецкім Саюзе свабоды думкі не існавала, атэізм меў характар афіцыйнай ідэалогіі. Таму значная частка насельніцтва яго ўспрымала як нешта навязанае. Існавала традыцыйная рэлігійнасць, якая мела стыхійны характар. Напраклад, амаль 100% насельніцтва Беларусі і пры камуністах святкавала Пасху. Нягледзячы на небяспеку, шмат якія людзі хрысцілі сваіх дзяцей. У падполлі дзейнічалі хрысціянскія суполкі. Але за гады Савецкай улады ў большасці людзей было страчана само разуменне таго, што такое рэлігія. У поўнай адпаведнасці з марксісцкай ідэалогіяй яе асноўнай функцыяй лічылася ілюзорна-кампенсатарная, яна зводзілася да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. І таму вельмі часта рэакцыяй людзей на змены пачатку 90-х гадоў, якія разбурылі звыклы лад іх жыцця, быў зварот да рэлігіі.

Рэлігія ўспрымалася як від ідэалогіі, якая прыйшла на змену камуністычнай. Інтэнсіўнае развіццё рэлігійнай сферы ў былых савецкіх рэспубліках даследчыкі тлумачаць "эфектам ківача". Людзі, па-першае, імкнуліся адштурхнуцца ад савецкай ідэалогіі, якая дыскрэдытавала сябе, па-другое, спачувальна ставіліся да рэлігіі, якую праследавалі ўлады, па-трэцяе, разглядалі яе як неад'емную частку нацыянальнай традыцыі. Але, як паказалі даследаванні, рэлігійнасць большай часткі насельніцтва Беларусі мае дэкларатыўны характар і не суадносіцца з іх рэальнымі паводзінамі. У рэлігійнай сферы зараз пануе неакрэсленая духоўнасць, лічыцца, што трэба ў нешта верыць. Большасць беларусаў атаясамлівае сябе з праваслаўем, але размова ў дадзеным выпадку ідзе не аб рэлігійнай, а аб культурнай ідэнтыфікацыі – чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да акрэсленай традыцыі.

Радыкальная змена стаўлення чалавека да рэлігіі прадугледжвае яго навяртанне, якое павінна суправаджацца зменамі ў жыццёвай арыентацыі. Чалавек па іншаму разумее сэнс жыцця, сваё месца ў свеце, сутнасць і мэту маральных паводзін. Феномен навяртання – гэта драматычны, і часта балючы, пералом ў свядомасці і паводзінах чалавека. Такое навяртанне патрабуе намаганняў і не можа адбыцца масава і легка. Трэба, каб чалавек прайшоў пэўны шлях і атрымаў вопыт веры. Наша сучаснае грамадства вельмі кароткі час жыве ва ўмовах свабоды сумлення, і значная частка людзей такі вопыт яшчэ не паспела атрымаць (хаця ў старэйшага пакалення вернікаў ёсць вопыт існавання ва ўмовах праследавання). Гэтым абумоўлена павярхоўнае прыняцце рэлігіі ў грамадстве, і яно не магло быць іншым.

Сацыялагічнае апытанне сведчыць, што колькасць тых, хто лічыць сябе вернікамі, на Беларусі няўхільна павялічваецца. Па сваіх адносных памерах гэтае павелічэнне адпавядае павелічэнню колькасці зарэгістраваных рэлігійных суполак. Згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, у 1988 г. да вернікаў сябе адносілі 15% рэспандэнтаў, у 1990 – каля 30%, у канцы 1990-пачатку 2000 гадоў – каля 50%, у 2006 г. – 58,9% [5, с. 39].

Такім чынам, на падставе прыведзеных вышэй дадзеных бачна, што большасць насельніцтва Беларусі лічыць сябе вернікамі. Але націск трэба зрабіць на слова *лічаць*. Прыведзеныя дадзеныя атрыманы на аснове рэлігійнай самаідэнтыфікацыі рэспандэнтаў. Калі ж пры аналізе ўлічыць аб'ектыўныя крытэрыі, такія, як, напрыклад, культавыя паводзіны, дык колькасць тых, каго можна акрэсліць як вернікаў, істотна скарачаецца.

Згодна з апытаннем, праведзеным у 2011 г. Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, "сапраўдным вернікам" лічыць сябе кожны пяты беларус, і сярод іх да праваслаўя сябе адносяць 57,3%, да каталіцтва – 34,5%, да пратэстанцтва – 3,1%. Пры гэтым на пытанне *"Ці былі Вы ў апошнія выхадныя ў храме?"* *станоўча адказалі толькі 6% удзельнікаў апытання* [6]. Таму пры аналізе рэлігійнасці насельніцтва Беларусі трэба выходзіць з пазначаных 6% альбо іншых падобных лічбаў.

Да гэтага дадаюцца рэшткі вельмі моцнай язычніцкай традыцыі, якая існавала на Беларусі. Самае масавае рэлігійнае свята ў нас зараз – гэта Радуніца. Але па тым, як яе святкуюць, можна зрабіць вывад, што гэта – былыя Вясеннія Дзяды ("дзядамі" на Беларусі называюць духаў памёрлых продкаў). Людзі ідуць на могілкі, ядуць там і п'юць, і частку ежы і пітва пакідаюць на магілах. Гэта чыста язычніцкі звычай кармлення "дзядоў". Яго рэлігійны сэнс большасць людзей зараз не асэнсоўвае, гэта ўспрымаецца як традыцыя. Але, безумоўна, такія дзеянні знаходзяцца па-за межамі хрысціянства.

Мы лічым, што рэлігія павінна заняць сваё месца ў нашым грамадстве. Адным з асноўных лозунгаў працэсу секулярызацыі было патрабаванне свабоды сумлення: дзяржава павінна прадставіць людзям права рэлігійнага самавызначэння, і яна не *можа пазбаўляць сваіх падданых грамадзянскіх і палітычных правоў у залежнасці ад іх прыналежнасці да той ці іншай рэлігіі, царкву неабходна аддзяліць ад дзяржавы.* Гэтыя ідэі заканадаўча замацаваны ў канстытуцыях большасці еўрапейскіх краін. У Канстытуцыі Беларусі няма прынцыпу аб аддзяленні рэлігіі ад дзяржавы, але фактычна ён у нашым заканадаўстве праводзіцца.

Такім чынам, працэс секулярызацыі прывёў да змены ролі рэлігіі ў грамадстве. Ва ўмовах светапогляднага плюралізму яна зрабілася справай свабоднага выбару чалавека, які, адпаведна, нясе асабістую адказнасць за свае рэлігійныя погляды, і яны *робяцца для яго больш значнымі. Мы лічым, што пашырэнне сферы рэлігіі ў нашай* краіне – доўгатэрміновы працэс, ён будзе паглыбляцца, і гэта з'яўляецца не толькі паказчыкам, але і фактарам трансфармацыі грамадства.

**Спісак цытаваных крыніц**


1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – 3-е выд. – Мінск: БелЭн, 2002. – 784 с.
2. Философский энциклопедический словарь / Гл. редакция: Л.Ф. Ильичев [и др.]. – М.: Сов. Энциклопедия, 1983. – 840 с.
3. Новая философская энциклопедия: в 4 т. / Научно-ред. совет: В. С. Степин [и др.]. – М.: Мысль, 2010. – Т. III – 692 с.
4. Слука, А.Г. Нацыянальная ідэя / А.Г. Слука. – Мінск: РІВШ, 2008. – 364 с.
5. Старостенко, В.В. Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории: монография / В.В. Старостенко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2011. – 272 с.
6. Опрос: Каждый пятый белорус считает себя истинно верующим. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://news.tut.by/society/279195.html.


## ЦЕННОСТНЫЕ ОРИЕНТАЦИИ В СФЕРЕ ВНУТРЕННЕГО КОНТРОЛЯ В ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЕ ВРАЧА


А.Г. Пацеева

*Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники, г. Минск, Беларусь*


Врачевание, как специфический вид деятельности, еще со времен предшествовавшего ему шаманизма было окутано атмосферой таинственности. Пациентам зачастую непонятен смысл врачебных технологий, в которые они вовлекаются, а попыт-